# Натхненне, пранесена

**Масленікавы — знакамітая дынастыя беларускіх мастакоў, якія ўслаўляюць прыгажосць нашай прыроды. Заснавальнікам лічыцца Павел Васільевіч, народны мастак Беларусі. Яго сын Уладзімір — жывапісец, загадчык кафедры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Унукі Павел, мастак, і Аляксей, дызайнер, па бацькоўскім прыкладзе займаюцца выкладчыцкай дзейнасцю. Паспяхова вучыцца на мастацкім факультэце БДАМ праўнучка Паўла Васільевіча Кацярына Масленікава.**

## ДЗЕД

— Самы першы мой успамін пра бацьку датычыць глыбокага дзяцінства, — распачынае аповед Уладзімір Масленікаў. Мы сядзім з ім ва ўтульным кабінеце кафедры жывапісу і графікі Акадэміі мастацтваў. Тут пануе пах фарбы, алею і драўніны, паўсюль развешаны і расстаўлены гатовыя карціны, накіды, эскізы. — Наша сям'я тады жыла на Чычэрына, бацька працаваў у Тэатры оперы і балета мастаком-пастаноўшчыкам. І я ўжо ў чатыры гады гаварыў, што буду мастаком і шафёрам.

Уладзімір Паўлавіч усміхаецца і тлумачыць: выбар абумоўлены прафесіямі бацькі і роднага дзядзькі, які быў кіроўцам. Маленькі Вова планаваў палову дня працаваць у тэатры мастаком, а пасля — перавозіць намаляваныя карціны. Лёс распарадзіўся інакш.

— Бацька браў мяне на эцюды з самага маленства, — згадвае суразмоўца. — Мы садзіліся ў старэнькі "Масквіч" і ехалі на прыроду: ён маляваў, а я балындаўся побач. Памятаю, неяк увесну падчас такога выезду я правалiўся ў ваду і набраў поўныя боцікі. Тата мяне разуў, пераапрануў і пасадзіў у машыну — а я чакаў, пакуль ён не скончыў працу.

Уладзімір Паўлавіч успамінае бацьку як надзвычай творчага і захопленага сваёй працай чалавека. Кажа, ён літаральна жыў мастацтвам:

— Іншым разам падавалася, што на першым месцы ў яго стаяла менавіта творчасць. Бывала, прыйдзе дадому на абед — і з парога крычыць гучным голасам: "Ніна, налівай хутчэй боршч, я ўжо сыходжу!" У гэтым ён быў увесь.

## СЫН

Дзяцінства, праведзенае поплеч з таленавітым бацькам — мастаком і настаўнікам, — не магло не накласці адбітак на светаўспрыманне і самаідэнтыфікацыю сына. Як і тата, Уладзімір Паўлавіч прысвяціў сябе творчасці.

— Ці ведаеце, наколькі цяжка быць сынам вялікага майстра? — запытвае ён. — Кожны імкнецца параўнаць цябе з ім, твае работы — з яго работамі. Магчыма, з гэтай прычыны я стараўся напачатку не выстаўляць свае пейзажы, хаця вельмі люблю гэты жанр. Каб не быць ценем бацькі, рабіў партрэты, нацюрморты.

Добрым стымулам стала рэпліка, кінутая няўзнак Масленікавым-старэйшым: "Хлопцы (мастакі-паплечнікі Паўла Васільевіча. — аўт.) кажуць, маўляў, карціны твайго сына вылучаюцца сярод іншых..."

— Заўважце: не ён сам мяне пахваліў, а быццам словамі сяброў, — звяртае ўвагу суразмоўца. — Ён быў надта скупы на ўхваленні. Аднак адабрэнне я ўмеў чытаць у татавых вачах. Як, дарэчы, і крытыку.

Па звычцы, што выпрацавалася з дзяцінства, Уладзімір Паўлавіч выязджае на прыроду на эцюды. Любіць паўночныя куткі Беларусі, пачынаючы з Лагойшчыны з яе непаўторнымі краявідамі, лясамі і пагоркамі — і далей на Віцебшчыну. Даспадобы яму Браслаўшчына, Глыбоччына, ваколіцы старажытнага Полацка, а яшчэ — Магілёўшчына.

— Памятаю, едзем з татам праз Лагойск, у краме купім мясцовы хлеб "цаглінку" і кольцы каўбасы і рушым у бок Зембіна — там такая прыгажосць! Бярозкі — нібы маладыя ў шлюбных сукенках!

На палотнах Уладзіміра Масленікава пазнаюцца асобныя мясціны. Але ёсць і кампазіцыйныя пейзажы, якія абагульваюць прыгажосць беларускай прыроды...

## УНУКІ

— Калі параўноўваю сябе з та...
здаецца, як бацька я для сваіх...
больш уважлівы і клапатлівы, — за...
Уладзімір Паўлавіч.

Іх у яго два: Павел і Аляксей. І...
пайшлі па слядах старэйшых Мас...
вых: Павел прысвяціў сваё жыццё...
пісу, Аляксей стаў дызайнерам.

— Хацеў бы я ім сваёй долі? —...
пытвае мастак. — Нават не ведаю...
цыяльна нейкім прыёмам я іх не...
не змушаў да творчасці. Але такс...
я некалі побач з бацькам, і мае с...
дзяцінства бавілі час разам са мной...
стэрні.

Спачатку, каб заняць гарэза...
цька даваў ім у рукі фарбы,...
чым — адразу алейныя. Павел...
давальненнем пэцкаў далог...
па кардоне і такім



Уладзімір ...
Маслен...



Павел Васільевіч
Масленікаў

"Жнівень"

## СЯМ'Я

— Ведаеце, ва ўсёй нашай вялікай і творчай сям'і толькі мая жонка, Таццяна Мікалаеўна, не звязана з мастацтвам, — з усмешкай гаворыць Уладзімір Паўлавіч. — Яна — інжынер!

На пытанне, як такое здарылася, паціскае плячыма: "Павінен жа хтосьці быць рэалістам! Летуценнікаў сярод Масленікавых зашмат!.."

І пачынае пералічваць. Сястра Вера, якой ужо, на жаль, няма сярод жывых, — доктар мастацтвазнаўства, прафесар, доўгі час працавала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Таццяна, жонка Паўла, — мастак, дызайнер, кніжны ілюстратар, педагог.

— Кожны з нас паміж паняццямі "сям'я" і "творчасць", думаю, можа паставіць знак роўнасці. Бо гэта два самыя важныя складнікі жыцця.

Яно і зразумела: дзяцінства і маладосць як самога Уладзіміра Паўлавіча,

так і Веры ...
фарбаў і мал...
вялікім Саве...
галава сям'і ...
ўзбочыне і п...
ную прыгажо...
і не зніклі до...
цемкі не пе...
ноч.

— Тата з м...
часта ездзілі...
так. — У баце...
мскіх краяв...
край — аб'езд...
паўвостраў!...
Беларусь.

